рысы асобы: назіральнасць, зрокавую памяць, пазнавальную актыўнасць. Адметнае значэнне мастацтва заключаецца ў тым, што яно дае разуменне дабра і зла, праўды і няпраўды, а без падобнага разумення эстэтычнае выхаванне падрастаючага пакалення ажыццяўляць немагчыма. Мастацтва садзейнічае ўсведамленню чалавекам сэнсу існавання, задавальняе патрэбнасць у пашырэнні ведаў пра свет, служыць сродкам зносін.

Атрымліваючы ад мастацкіх твораў велізарную колькасць уражанняў, падлетак перапрацоўвае іх, рэалізуе ў творчай дзейнасці. Такім чынам, мастацтва выконвае важную функцыю развіцця здольнасці дзяцей да творчасці, якая потым выкарыстоўваецца імі ў вучобе, працы.

Важна, каб асоба як мага раней сустрэлася з мастацтвам. Выхаваныя з дзіцячых гадоў здольнасць адчуваць, разумець мастацтва, любоў да яго захоўваюцца на ўсё жыццё, уплываючы на фарміраванне эстэтычнага густу чалавека.

**Высоцкі Г.В.,**
*аспірант кафедры педагогікі сацыякультурнай дзейнасці*

## УЗДЗЕЯННЕ НА СІСТЭМУ КАШТОЎНАСЦЕЙ ШКОЛЬНІКАЎ ШЛЯХАМ ПАВЫШЭННЯ СТАТУСА ЎДЗЕЛЬНІКАЎ МАСТАЦКАЙ ТВОРЧАСЦІ

Каштоўнасныя арыентацыі адносяцца да такіх агульнанавуковых паняццяў, значэнне якіх для педагогікі вельмі важнае. Гэта абумоўлена тым, што галоўная функцыя каштоўнаснага арыентавання заключаецца ў забеспячэнні сувязей паміж грамадствам і асобай, а яго сэнс у тым, каб дзейнасць індывіда мела пазітыўны характар і ў сацыяльным, і ў індывідуальным планах.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Праблема каштоўнасных арыентацый непасрэдна звязана таксама, па-першае, з праблемамі сацыяльнай структуры грамадства, па-другое, праблемамі структуры самой асобы, яе тыпалогіі. Нарэшце, менавіта ў каштоўнасных арыентацыях асобы выяўляюцца яе выбіральныя адносіны да аб'ектаў, якія могуць задаволіць самыя разнастайныя яе патрэбнасці, у тым ліку эстэтычныя, мастацкія, што займаюць асобнае месца ў фарміраванні духоўнай культуры асобы. Безумоўна, фарміруючы патэнцыял адпаведных каштоўнасцей тым большы, чым вышэй месца іх у каштоўнаснай іерархіі.

У псіхолага-педагагічнай літаратуры неаднаразова звярталася ўвага на тое, што адзін з вядучых фактараў фарміравання каштоўнасных арыентацый дзіцяці — гэта жыццядзейнасць школьнага калектыву. У сувязі з гэтым М.Г.Казакіна адзначае: "Станаўленне грамадска значных каштоўнасцей у выхаваўчым калектыве, які развіваецца, непазбежна дэтэрмінуе фарміраванне адэкватных каштоўнасных арыентацый у яго членаў. І наадварот, калектыў са збедненым жыццём (адсутнасць эмацыянальна яркіх падзей і сур'ёзных спраў, фармалізм у арганізацыі і зносінах) не акумулюе аб'ектыўныя каштоўнасці... грамадства, не трансфармуе іх у суб'ектыўныя каштоўнасці асобы, не ўзбагачае апошнімі". У дачыненні да праблемы ўзаемадзеяння асобы і калектыву, каштоўнаснага абмену паміж імі звычайна прыняты наступныя характарыстыкі: сістэма маральна-інтэлектуальных каштоўнасцей калектыву (уключаючы каштоўнасці мастацкія), яго эталоннасць для пэўнай асобы, статус гэтай асобы ў ім. Дзве апошнія характарыстыкі вызначаюць ступень фарміруючага ўздзеяння калектыўнай сістэмы каштоўнасцей на асобу. Яна тым вышэй, чым больш спрыяльнае становішча ў калектыве займае школьнік, чым больш эталонным гэты калектыў для яго з'яўляецца.

Даследаванні міжасобаснага статуса ў навуцы ажыццяўляліся пераважна па двух асноўных напрамках.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Першы з іх характарызуецца цікавасцю да вывучэння ўплыву статуса на фарміраванне асобы навучэнцаў (Л.І.Бажовіч, Т.В.Драгунова, Л.С.Славіна, Т.Е.Коннікава, А.Б.Цэнцыпер), другі — цікавасцю да вывучэння залежнасці статуса ад розных асобасных характарыстык школьнікаў (Я.Л.Каламінскі, В.Н.Лазоцева, Т.Н.Малькоўская, М.І.Бараўскайтэ і інш.).

Яшчэ А.С.Макаранка паказаў, што, змяняючы становішча (статус) асобы ў калектыве, можна аказваць на яе істотнае фарміруючае ўздзеянне. Адваротны бок такога ўзаемнага ўздзеяння ўяўляе ідэнтыфікацыя, калі кожны з членаў калектыву імкнецца атаясамліваць сябе з асобай, якая мае ў калектыве найвышэйшы статус, пераймаючы звычкі, капіруючы паводзіны і г.д. З гэтага вынікае: высокастатусная асоба аказвае фарміруючае ўздзеянне на ўвесь калектыў, г.зн. у пэўнай ступені змяняе сістэму калектыўных каштоўнасцей.

Т.-К.Х.Аўнапуу ў сваім даследаванні адзначыла той факт, што аднакласнікі імкнуцца браць прыклад з высокастатусных навучэнцаў, жадаюць быць на іх падобнымі. Такім чынам, апошнія ўздзейнічаюць на розныя бакі жыцця вучэбнага калектыву. Таму ў педагагічнай практыцы неабходна ведаць асаблівасці спосабу жыцця навучэнцаў і ўлічваць іх, дзеля таго каб пазбегнуць інтэрыярызацыі адмоўных з'яў, што сустракаюцца ў дзяцей з невысокім узроўнем выхаванасці. І наадварот, чым больш выхаваны вучань з пункту гледжання засваення ім агульнакультурных, агульначалавечых каштоўнасцей, уключаючы каштоўнасці мастацкія, тым больш педагог павінен садзейнічаць працэсу інтэрыярызацыі.

Такія даследчыкі, як Я.Л.Каламінскі, Н.П.Анікеева, Г.В.Віннікава, у сваіх працах паказалі, наколькі моцнай з'яўляецца наступная карэляцыйная сувязь: "статус асобы ў калектыве — сістэма калектыўных каштоўнасцей". На аснове гэтага яны вывелі палажэнні аб тым,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

што ўплыў асобы на калектыўныя каштоўнасці тым большы, чым вышэй статус яе ў калектыве; асоба мае вялікую магчымасць заняць спрыяльнае становішча ў калектыве тады, калі яе каштоўнасныя ўстаноўкі адпавядаюць каштоўнасцям калектыву.

Адзначым таксама, што ў дачыненні да праблемы калектыўнага функцыянавання некаторыя даследчыкі вылучылі два тыпы высакастатусных вучняў: 1) дзелавыя (інструментальныя) лідэры, якія пераважна займаюцца рашэннем задач, што стаяць перад калектывам, і 2) эмацыянальныя (у тэрміналогіі аўтараў) лідэры, што маюць высокі статус у сістэме сацыяльна-эмацыянальных адносін. Мы мяркуем: дзеці, занятыя мастацкай творчасцю ў мастацкіх аб'яднаннях, могуць быць эмацыянальнымі лідэрамі. Дзейнасць іх у калектыве будзе сканцэнтравана ў асноўным на міжасобасных зносінах.

Вучоныя паказалі, што статусам асобы абумоўлены выбар ёю рэальных рэферэнтных груп. Так, агульна-прызнаны ў педагагічнай навуцы факт моцнага ўплыву на паводзіны асобы неафіцыйных адносін у нефармальных групоўках. Выяўлена: эталоннасць, значнасць зносін у калектыве залежаць ад таго, наколькі патрэбнай, абароненай, прызнанай пры гэтым адчувае сябе асоба, нават калі інтэлектуальна-духоўная атмасфера калектыву з'яўляецца неспрыяльнай.

Незалежна ад гэтага паміж асобай і калектывам пастаянна ажыццяўляецца абмен каштоўнасцямі. Кожны вучань уступае ў адносіны з іншымі школьнікамі ў працэсе выканання сваёй унікальнай у сістэме ўзаемаадносін сацыяльнай ролі. У выніку ён нясе ў калектыў уласныя каштоўнасныя арыентацыі, засвойвае ў той або іншай ступені каштоўнасці, уласцівыя калектыву. Гэты аб'ектыўны працэс у значнай ступені ўплывае на адносіны паміж вучнямі. На думку Я.Л.Каламінскага, "нават суб'ектыўна перажываемыя як непасрэдная сімпатыя ўзаемаадносіны паміж школьнікамі аб'ектыўна

апасродкаваны тымі сацыяльна-псіхалагічнымі эталонамі, стандартамі і стэрэатыпамі, якія засвоены імі ў працэсе калектыўнай дзейнасці, у працэсе выхавання".

Школьны ўзрост з'яўляецца сензітыўным перыядам для сацыялізацыі. Патрэбнасць дзіцяці ў самавызначэнні — спачатку ў калектыве равеснікаў, потым у больш шырокім соцыуме — абумоўлівае неабходнасць пошуку найбольш эфектыўных спосабаў педагагічнага кіравання працэсам фарміравання статусных адносін.

Даследаванні прычын, што выклікаюць набыццё школьнікам таго або іншага статуса, маюць аднабаковы ў некаторай ступені характар. Як было адзначана вышэй, асноўная ўвага ўдзяляецца вывучэнню ўплыву асобасных якасцей вучняў на іх статус. Але мы прытрымліваемся думкі, што гэтыя якасці з'яўляюцца не адзінай дэтэрмінантай статуса. Акрамя іх, вырашальны ўплыў маюць асаблівасці спосабу жыцця школьніка, якім або аддаецца равеснікамі перавага, або яны адмаўляюцца ад іх. У ракурсе праблемы, што выклікае цікавасць, важным уяўляецца факт удзелу школьніка ў мастацка-творчай дзейнасці ў рамках любой установы вольнага часу. Гэты ўдзел можа спрыяльна ўплываць на статус вучня сярод яго аднакласнікаў.

У псіхолага-педагагічнай літаратуры вызначаны некаторыя падыходы да праблемы педагагічнага ўздзеяння на статус асобы ў калектыве, утрымліваецца матэрыял, які адлюстроўвае асобныя з'явы, бакі гэтага працэсу. Але на сённяшні дзень недастаткова даследавана тое, наколькі дэтэрмінуючым для статуса можа быць факт удзелу дзіцяці ў мастацка-творчай дзейнасці. Не вызначана роля работнікаў мастацкіх аб'яднанняў школьнікаў у працэсе павышэння статуса выхаванцаў. Змест і метады работы па мэтанакіраваным уплыве на статус асобы ў залежнасці ад яе сацыяльна каштоўных якасцей не сталі яшчэ аб'ектам увагі даследчыкаў. Да гэтага часу няма сур'ёзных метадычных распрацовак, якія тычыліся б практычных

магчымасцей выразна праявіць сваю мастацкую творчасць. Значыць, патрэбная мэтанакіраваная работа над павышэннем статусу ў класе дзяцей, што займаюцца мастацкай творчасцю. Высокі статус іх з'яўляецца зарукай таго, што мастацка-эстэтычныя каштоўнасці, носьбітамі якіх з'яўляюцца гэтыя дзеці, могуць быць паспяхова інтэрыярызаваны астатнімі, рэгуляваць іх паводзіны.

Цяпер звернемся да асобных магчымых спосабаў педагагічнага кіравання статусам школьнікаў, што займаюцца мастацкай творчасцю, у вучэбных калектывах. Прыцягненне такіх дзяцей да арганізацыі, правядзення разнастайных конкурсна-гульнявых, канцэртна-гульнявых праграм у сваіх класах спрыяльна адбіваецца на іх становішчы. У працэсе гэтага ў дзяцей развіваецца грамадская актыўнасць. Я.Л.Каламінскі адносіць яе да асноўных якасцей школьніка, высока ацэньваемых аднакласнікамі, пазітыўна ўплываючых на яго статус. Дзейсным спосабам з'яўляецца і рэгулярнае выкарыстанне магчымасцей заахвочвання, напрыклад узнагароджанне дзяцей, якія выяўляюць найбольшую мастацкую актыўнасць, грама-тамі, сувенірамі і да т.п. Калектыў павінен бачыць, што праца юнага артыста, які імкнецца даць аднагодкам задавальненне ад зносін з мастацтвам, заўсёды будзе ацэнена па заслугах. Такія адносіны дарослых да творчага дзіцяці становяцца прыкладам адносін для ўсіх дзяцей.

Акрамя таго, Я.Л.Каламінскі ўказвае ў сувязі з праблемай статусу на такія якасці навучэнцаў: прыгожая знешнасць, упэўненасць у сабе. У малодшых гэта гульнявыя якасці. Развіццю іх у выхаванцаў выхавацелі павінны ўдзяляць пастаянную ўвагу. Рыхтуючы канцэрт, варта падумаць пра касцюмы юных артыстаў, іх акуратнасць, паводзіны на "сцэне". Неабходна дабівацца ўпэўненага выканання патрабаванай праграмай ролі, пазбегнуць магчымых няўдач, звязаных з імі эмацыянальных траўмаў. У час правядзення мерапрыемства неабходна

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

даць дзецям такую ступень самастойнасці ў зносінах, якая не перашкаджала б выяўленню іх адметных якасцей.

Падводзячы вынікі, зазначым, што, педагагічна ўздзейнічаючы на статус дзяцей, якія займаюцца мастацкай творчасцю ва ўстановах па арганізацыі вольнага часу, мы не толькі далучаем да мастацтва больш шырокае кола навучэнцаў, прапагандуем удзел у разнастайных гуртках, аб'яднаннях. Мы яшчэ і закладваем фундамент будучых "дарослых" адносін да сапраўдных чалавечых каштоўнасцей, да носьбітаў іх.

**Каляда У.Р.,**
*аспірант кафедры педагогікі сацыякультурнай дзейнасці*

## ДА ПЫТАННЯ АБ АКАЗАННІ САЦЫЯЛЬНА-ПСІХАЛАГІЧНАЙ ДАПАМОГІ СЯМ'І

Пошук шляхоў развіцця сучаснага грамадства, у тым ліку ў нашай дзяржаве, востра паставіў праблему сям'і. Вядома, што грамадства пачынаецца з сям'і, якая з'яўляецца трансляторам духоўных і матэрыяльных каштоўнасцей. Погляд псіхолагаў, сацыяльных работнікаў, палітыкаў, эканамістаў на становішча першаэлемента грамадскіх адносін у сувязі з грамадскімі пераўтварэннямі на сённяшні дзень даволі трывожны.

Што выклікае трывогу?

Па-першае, сям'я страчвае сваю выхаваўчую функцыю, становіцца прыдаткам грамадскага выхавання (дзіцячыя сады, школы, хаця апошнія выконваюць больш функцыю навучальную, чым функцыю па фарміраванні асобы).

Па-другое, адбываецца паступовае выцясненне эмацыянальнай блізкасці ў сям'і рацыянальнымі ўзаемадносінамі паміж яе членамі.

Па-трэцяе, расце колькасць сем'яў з неадэкватнай формай узаемаадносін (нормамі ў такіх сем'ях становяцца



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ